Рэвалюцыйныя падзеі 1905 года ён сустрэў усё ж такі на Чарнігаўшчыне — настаўнікам школы ў мястэчку Грамяч. Язэпа даволі часта бачылі сярод арганізатараў сходак, калектыўнай чыткі газет... За гэта неўзабаве і трапіў ён у Ноўгарад-Северскую турму. Прасядзеў у ёй Лёсік два гады, а калі царызм пачаў зводзіць рахункі з канкрэтнымі віноўнікамі, яго павезлі на суд у горад Старадуб. Аднак літаральна праз некалькі дзён з тамтэйшай турмы ён уцёк. Ажно да 1911 года хаваўся Язэп у сваякоў у Стоўбцах, Пецярбургу, на станцыі Красноўка Лугансікам губерні. Згубіўшы пільнасць, ён неспадзявана для Антона зноў завітаў да яго ў Ноўгарад-Северск... Арышт і суд усё ў тым жа Старадубе закончыліся строгім вердыктам: бестэрміновае паселенне ў Сібір!

Звыш шасці гадоў таміўся Лёсік у халоднай і галоднай Сібіры. Спачатку жыў у горадзе Кірэнску Іркуцкай губерні, потым — у Балайбо. Там пазнаёміўся і моцна пасябраваў з Алесем Прушынскім (вядомым ужо тады беларускім паэтам Алесем Гаруном). Іхнія погляды на падзеі і жыццё наогул у многім супадалі, таму пагаварыць і паразважаць аб лёсе роднай старонкі ім было аб чым... Менавіта Гарун параіў Лёсіку падтрымліваць сувязі з газетай "Наша ніва", якая спакваля станавілася сапраўдным культурным асяродкам беларускіх нацыянальных вызвольнікаў.

Вызваленне са ссылкі Язэпу, як і многім сотням іншых пакутнікаў, прынесла лютаўская рэвалюцыя 1917 года. Ён неадкладна бярэ накірунак у Мінск, дзе, на думку маладога змагара, яго чакала цікавая і патрэбная справа.

Якраз тады — з лютага па кастрычнік 1917-га — на Беларусі панавала сапраўдная шматпартыйнасць. Партыі кадэтаў і "акцябрыстаў", бальшавікоў і меншавікоў, Бунд і эсэры, народнікі і сацыял-дэмакраты мелі рэальную магчымасць выказваць і спавядаць свае погляды і падыходы да вырашэння спрадвечных расійскіх пытанняў: "Што рабіць?" і "З чаго пачаць?"... Сярод сацыял-дэмакратаў імкліва адраджалася і набірала вагу Беларуская сацыялістычная Грамада, што вяла свой летапіс яшчэ з 1902 года. Язэп Лёсік і вырашыў звязаць з ёй свой лёс.

У сакавіку 1917 года ў Мінску прайшоў з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Ён выбраў Беларускі нацыянальны камітэт, у саставе якога ўвайшлі буйныя памешчыкі, прадстаўнікі левага крыла Грамады, буйной і дробнай буржуазіі, а таксама адзін рабочы. Камітэт літаральна адразу прад'явіў Часоваму ўраду патрабаванне аб прадастаўленні аўтаноміі Беларусі. З 28 мая БНК пачаў выдаваць грамадска-палітычны, эканамічны і літаратурны орган — газету "Вольная Беларусь", прызначыўшы рэдактарам Язэпа Лёсіка. Дарэчы, закрыта газета была толькі напрыканцы 1918 года — натуральна ж, бальшавікамі за контррэвалюцыйную прапаганду і агітацыю.

Кастрычніцкую рэвалюцыю Беларуская сацыялістычная Грамада не прызнала. 27 кастрычніка (па старым стылі) 1917 года яна разам з Вялікай Беларускай радай, часовай Цэнтральнай беларускай вайсковай радай, Беларускім выканаўчым камітэтам Заходняга фронту і Беларускай народнай партыяй сацыялістаў выдалі маніфест "Грамата да беларускага народа", у якім гаварылася: "У гэтыя дні нам належыць паказаць сапраўды, што змучаная пакутай беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя не дапусціць, каб віхор бязладу (масца на ўвазе Вялікі Кастрычнік. — **Заўвага А.М.**) загубіў нашу святую нацыянальную справу абароны вольнасцей і правоў беларускага народа". Сказана, як бачым, адназначна і катэгарычна! Не хацеў нават і слухаць аб падпарадкаванні ўладзе бальшавікоў і Язэп Лёсік са сваёй "Вольнай Беларуссю".

А потым быў і Усебеларускі з'езд, на якім 1872 дэлегаты з рашаючымі і дарадчымі галасамі мелі намер афіцыйна абвясціць беларускую дзяржаўнасць. Даўшы спачатку дазвол і нават аказаўшы фінансавую падтрымку яго правядзенню, бальшавікі, тым не менш, сілай разагналі з'езд. Ордэр на гэтую брудную справу падпісаў К.Ландэр: "Оцепить здание, где происходит заседание Белорусского съезда, арестовать Президиум съезда, а равно избранный им орган краевой власти, отозвать со съезда тт. большевиков и стоящих на точке зрения Советской власти, и самый съезд объявить распущенным..." Барацьба за ўладу набывала жорсткі і бескампрамісны характар. Калі ж 18 сакавіка 1918 года Выканаўчы камітэт Беларускага з'езда быў рэарганізаваны ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, яе членам абралі і Язэпа Лёсіка.

Напрыканцы красавіка 1918-га Я.Лёсік разам з Я.Серадой, Я.Варонкам, А.Аўсянікам, П.Крэчэўскім, П.Алексюком, Р.Скірмунтам і А.Уласавым падпісаў тэлеграму на імя кайзера Германіі Вільгельма II, у якой ад імя Рады БНР заявілі, што будучыню Беларусі бачаць "толькі пад апекай германскай дзяржавы". У выніку гэтага адбыўся раскол Грамады на тры часткі, а ва ўрадзе Беларускай Народнай Рэспублікі пачаўся крызіс. Летам таго ж года да ўлады (няхай сабе і ўяўнай) прарываецца памешчык Раман Скірмунт, і 9 ліпеня ён фарміруе новы сакратарыят Рады БНР. Прэзідэнтам становіцца Язэп Лёсік, віцэ-прэзідэнтамі — Аркадзь Смоліч і Аляксандр Уласаў, сакратарамі — Пётра Крэчэўскі і Мікола Янкоўскі. Сам Скірмунт узяў сабе партфель старшыні сакратарыята.

Аднак на палітычным фронце поспех ім, што называецца, не свяціў. Улады, нібыта ў калейдаскопе, змянялі адна другую, кіраўнікоў Беларускай Народнай Рэспублікі да сябе проста не падпускалі. Адны — бальшавікі — іх відавочна пабойваліся, другія — немцы і палякі — хутчэй за ўсё не бачылі ў іх рэальнай палітычнай сілы: ніводнай воласці, не кажучы ўжо пра губерню ці вялікі горад, дзе б Рада БНР мела канкрэтную ўладу, уплыў на мясцовае насельніцтва, проста не было. І гэта варта мець за рэальнасць!

Бачачы і выдатна ўсведамляючы ўсё гэта, Язэп Лёсік усё больш і больш пачынае скіроўваць свае асабістыя намаганні на іншы фронт — культурны.

У час акупацыі Беларусі нямецкімі і польскімі інтэрвентамі Лёсік жыў і працаваў у Мінску. Дзякуючы ягоным асабістым намаганням, тут працавалі беларускія гімназіі, школы, выдавецтвы, тэатры, Мінскі педагагічны інстытут, выходзілі газеты, у тым ліку — "Беларусь", якую ў 1920 годзе рэдагаваў сам Язэп Юр'евіч. Ён быў адным з арганізатараў і выкладчыкам курсаў беларусазнаўства, што працавалі з красавіка 1918-га. У тым жа 1918 годзе па прапанове Лёсіка народны сакратарыят БНР прыняў пастанову аб абвяшчэнні беларускай мовы "гасударственным і абавязковым языком Рэспублікі". У адпаведнасці з ёй нацыянальныя меншасці Беларусі маглі карыстацца сваімі мовамі ў афіцыйных зносінах з урадавымі ўстановамі, аднак "усе акты, дакументы і перапіска ўрадавых устаноў павінны пісацца гасударственным беларускім языком..." Усё тое магло стаць рэальнасцю, але, на жаль, не стала.

У кастрычніку 1918 года Рада БНР зацвердзіла на сваім пасяджэнні саставу надзвычайнай дэлегацыі (Р.Скірмунт, Я.Лёсік і І.Луцкевіч) для паездкі ў Берлін з мэтай уступлення ў перагаворы з германскім урадам аб прызнанні БНР і прынцыпі мер да нявываду з тэрыторыі Беларусі нямецкіх войскаў. Аднак у дарозе яны даведаліся аб рэвалюцыі ў Германіі, у выніку якой Вільгельм быў скінуты паўстаўшым нямецкім народам.

Пасля выгнання з Беларусі белапалякаў (ліпень 1920 года) кіраўнікі Беларускай Народнай Рэспублікі, ратуючыся ад праследаванняў бальшавікоў, разляцеліся па белым свеце, хто куды змог і паспеў. Язэп Лёсік адным з першых з іх заявіў неўзабаве аб прызнанні савецкай улады.

Пачаўшы супрацоўніцтва з бальшавікамі, ён адышоў ад палітычнай дзейнасці поўнасцю. Язэп Юр'евіч канцэнтраваў сваю ўвагу, сілы і здольнасці на навуковай, культурна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасці. І ў кожнай з іх дасягнуў вялікіх поспехаў, багатых і так патрэбных нашаму народу набыткаў.

Яму было ўжо пад сорак — узрост сталы і мудры. Прайшлі, адышлі ў нябыт ілюзіі аб магчымасці дасягнення поўнай самастойнасці і незалежнасці Айчыны ў тагачасных умовах. У вырашэнні праблем свабоды Бацькаўшчыны мінулі і надзеі на дапамогу немцаў і палякаў... Лёсік зразумеў: родны народ можа і павінен прыйсці да самастойнага вольнага жыцця толькі праз шлях самавызначэння. Праца ў галінах культуры, навукі, адукацыі ў імя дасягнення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці становіцца зместам і сэнсам усяго ягонага далейшага жыцця.

Ужо ў 1924-м, у адной з першых сваіх грунтоўных прац — артыкуле "Культурны стан Беларусі к моманту Лютаўскае рэвалюцыі" — ён напіша (тут і далей захаваны правапіс самога Лёсіка): "Як сьвядомасьць вызначаецца быцьцём, так культурны стан народа вызначаецца яго эканамічна-грамадзянскімі ўзеемаадносінамі. Культура становіць адбітак народнага жыцьця і зьяўляецца прадуктам разумовай творчасьці людзей на падставе іх матар'яльнага быту".

Ён пісаў мастацкія творы, перакладаў на беларускую з іншых моў (дарэчы, з нямецкай Язэп Юр'евіч пераклаў на нашу Маніфест Камуністычнай партыі Маркса і Энгельса), аднак паступова прадметам асаблівых клопатаў і турбот яго становіцца развіццё і ўдасканаленне роднай беларускай мовы. І ў гэтым накірунку Лёсік займеў асабліва важкія набыткі.

У архівах Нацыянальнай акадэміі навук, Нацыянальнай бібліятэцы, Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа і ў прыватных захоўваннях я пабачыў і пазнаёміўся з васьмю выданнямі навуковых мовазнаўчых прац даследчыка. Яны былі выдадзены на працягу 1921—1927 гадоў. Гэта "Беларускі правапіс", "Школьная граматыка беларускае мовы", "Сынтакс беларускае мовы", "Граматыка беларускае мовы. Фонэтыка", "Граматыка беларускае мовы. Морфолёгія", "Практычная граматыка беларускае мовы", "Наша крыніца (кніга для чытаньня)", "Пачатковая граматыка беларускае мовы". Дапаможнікі па граматыцы, як сведчылі відавочцы, карысталіся асаблівай папулярнасцю. Яны выдаваліся тыражом у некалькі тысяч экземпляраў і даволі хутка распрадаваліся. І не дзіва: беларусы, і найперш маладое пакаленне, імкнуліся да ведаў, да спасціжэння асноў роднай матчынай мовы.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля
10 СНЕЖНЯ 1998 г.

Змагар за нацыянальнае Адраджэнне

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Цяпер бы такія памкненні і апантанасць!

А яшчэ Лёсік чытаў лекцыі ў толькі што створаным Беларускім універсітэце, актыўна працаваў потым у Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульце), быў адным з арганізатараў і дакладчыкам Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў лістападзе 1926 года. У ліку першых за ўсе гэтыя відавочныя заслугі перад беларускай нацыянальнай адукацыяй і асветніцтвам Язэпу Юр'евічу Лёсіку ў 1929-м было нададзена званне правадзейнага члена (акадэміка) Беларускай акадэміі навук.

У ягонай даследчыцкай спадчыне ёсць мноства цікавых назіранняў, вывадаў, ацэнак. У прыватнасці, Лёсік сцвярджаў, што беларуская культура і беларуская самабытнасць на той час захоўваліся толькі ў "землеробскіх сялянскіх масах". Такое становішча, на ягоную думку, пачалося яшчэ з XVI стагоддзя, калі "беларускае баярства, а за ім і іншыя прывілейныя станы, адарваныя ад працоўных гушч сацыяльна, сталі пераймаць чужую, галоўным чынам польскую, мову і польскую культуру. Гэта скончылася тым, што беларуская мова, як адзіны фактар разумовай творчасьці народу, была пастаўлена на ступень простай, хамской, мужычай, нядатнай да культурнага развіцьця разам з тымі працоўнымі, сацыяльна прыгнечанымі масамі, што ў гэтай мове гаварылі". Гэта абасобленасць, падкрэсліваў ён, і стала прычынай таго, што да пачатку дваццатага стагоддзя аб беларускай інтэлігенцыі не магло быць і гутаркі. Не абышоў Лёсік маўчаннем і тэму беларускага нацыянальнага Адраджэння: "Сапраўдны беларускі рэнесанс распачаўся толькі напярэдадні Лютаўскае рэвалюцыі 1917 года і стаў навочнай рэальнасцю пасля перавароту ў кастрычніку..."

У публіцыстычнай творчасці Язэпа Юр'евіча асноўнае месца займаюць тэмы незалежнасці, нацыянальнага адраджэння Айчыны, гісторыі і будучыні Беларусі. У артыкулах "Вольная Беларусь", "Нацыянальны ўціск", "Цёмныя сілы заварушыліся", "Хто вінавайца вайны", "Праціўнікам беларускага руху", "Чаму гэта так?", "Нашы патрэбы", "Нашто нам федэрацыя?", "Гістарычная няўхільнасць", "Рабочы стан пануючых і прыгвалчаных нацый" і іншых, напісаных на працягу 1917—1918 гадоў, ён на яркіх, змястоўных і пераканаўчых прыкладах паказаў, што "ні маскалём, ні палякам народ наш зрабіцца не мог, ды немагчыма гэта цэлай нацыі ніколі", што "стаяць нерухома гісторыя не можа, бо гісторыя — гэта само жыццё людзей, а жыццё павінна развівацца ды ісці наперад, калі не жадае памерці", што "чужой мовай гора не выкажаш, чужым словам жалю не вылажыш". Палымяны трыбун, непараўнальны майстар слова, Лёсік заклікаў землякоў-беларусаў не плакаць, не спаць, а "ачнуцца, забраць сваю справу ў свае рукі і будаваць сваё жыццё ўласнымі захадамі". Лёсы вялікарусаў, украінцаў, беларусаў, літоўцаў, татар, латышоў, грузін і іншых народаў ён бачыў у "будаванні свайго жыцця паводле сваіх патрэб, свайго дабрабыту і культурнага росквіту" ў адзінай федэратыўнай рэспубліцы, "дабравольнай супольцы вольных дэмакратычных рэспублік", якія, на думку Лёсіка-даследчыка, "дзе-якія супольныя дзяржаўныя справы перадаюць супольнаму (цэнтральнаму) ураду". "Настала свабода, — пісаў ён, — мы павінны дабіцца сабе аўтаноміі і стварыць у сябе свае ўласныя беларускія парадкі і зажыць сваім уласным беларускім жыццём".

Актуальна гучыць і сёння, ці не праўда?!

За справу "сапраўднага беларускага рэнесансу" Лёсік у рэшце рэшт і паплаціўся жыццём.

Ганенні на яго пачаліся літаральна адразу ж, як толькі ён прызнаў савецкую ўладу. Яшчэ ў 1921 годзе, пасля выхаду ў свет "Практычнай граматыкі беларускае мовы", "Звезда" назвала падручнік контрэвалюцыйным. Але што ж магло быць там "контрэвалюцыйным"?

Правілы граматыкі?

Прыклады для навучання?

Не, хутчэй за ўсё "контрэвалюцыйным" стаў тады сам факт выхаду ў свет для шырокіх народных мас першай у гісторыі Беларусі "Практычнай граматыкі беларускае мовы".

І хаця тады тое абвінавачанне засталося без рэакцыі, у "патрэбны" момант ад ім успомнілі.

Першы раз яго арыштавалі ў ліпені 1930 года, калі акадэмік лячыўся на курорце ў Мацэсце. Абвінавачаны ў нацдэмаўскай дзейнасці, ён быў высланы на пяць гадоў у Паволжа. Тэрмін ссылкі заканчваўся ў 1936-м, але Лёсіку і потым не дазволілі вярнуцца на радзіму. Спачатку Язэп Юр'евіч выкладаў рускую мову ў школе на станцыі Злынка непадалёку ад Наваз'ыбкава, потым — у педагагічным тэхнікуме ў горадзе Актарску Саратаўскай вобласці. Там і знайшлі яго супрацоўнікі НКУС у час другога арышту.

Яшчэ два з паловай гады прасядзеў ён у саратаўскай турме №2. У 1940 годзе сям'і Язэпа Юр'евіча паведамілі, што ён памёр ад сухотаў...

Біяграфіі і лёсы такіх людзей сёння трэба ведаць кожнаму беларусу. Бо калі мы страцім памяць — мы страцім урэшце ўсё.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

За чашечкой кофе с Мариной КОКТЫШ

Поцелуй актерского счастья

Его по-прежнему узнают на улицах. По спектаклям. Раньше, когда много снимался в кино, даже в магазинах без очереди пропускали. Сейчас предложений сняться в кино к нему уже давно не поступало. Да и, собственно, к кино он теперь как-то охладел. Говорит, что единственный шанс оставить значительный след в кинематографе был, когда его приглашал сниматься Марлен Хуциев. Но он, к сожалению, этот шанс упустил...

До сих пор помнит свою первую серьезную роль. Он играл Крота в пьесе "Ремка". Правда, какой след тот Крот оставил в его жизни, сразу ответить затрудняется...

С надоедливыми поклонницами "расправляться" не приходится. Они у него все воспитанные: после одиннадцати вечера не звонят, домой не приходят...

В своем творчестве актер Государственного Молодежного театра Сергей ЖУРАВЕЛЬ всегда переживает период недовольства. Потому что по натуре — безжалостный самоед.

Мы с ним пили кофе и говорили о любви. Любви к самому себе, родине, театру. Ну а началось все, естественно, с любви к женщине.

— В спектакле "Что такое любовь?" по сценарию Вы должны вместе с какой-нибудь зрительницей продемонстрировать "первые уроки любви". Моя подруга, проведя вместе с Вами на сцене всего пару минут, до сих пор не может забыть тот страстный поцелуй, на котором, собственно, вся любовь и заканчивалась. С тех пор она беспрестанно слушает Ваши рекламные ролики на радио "Би-эй", пересмотрела практически все спектакли с Вашим участием, даже видеокассеты с Вашими старыми фильмами где-то откопала. Говорит, что такого темпераментного мужчину в своей жизни повстречала впервые... Как полагаете, много ли женщин тайно вздыхают по Журавлю, признаются в любви и мечтают всю себя посвятить только ему?

— А почему мне эта девушка сама ничего не сказала?.. Если серьезно, было время, когда мне регулярно звонили, писали любовные письма, на лобовом стекле машины оставляли трогательно-чувственные признания. Как правило, это были молодые девчонки. Наверное, взрослые дамы не чувствуют себя так раскованно. Даже после ревю на темы любви и сексуальности "Что такое любовь?". Я в этом спектакле действительно по сценарию приглашаю из зала какую-нибудь очаровательную зрительницу, чтобы на ее примере показать, как нужно целоваться. В принципе, здесь больше юмора, нежели эротики. Но, видимо, сам процесс выхода на сцену и участия в этом чувственном шоу дает повод многим женщинам надеяться на какую-то взаимность с моей стороны...

— И все же, может ли хороший актер быть хорошим семьянином?

— Если говорить обо мне, то нет. У меня было два брака. Есть тринадцатилетний сын. С семьей не живу уже лет шесть. На данный момент пребываю в состоянии одиночества. Надеюсь, этот передых временный... Семья — это сложно. Ей надо уделять время, заботиться. У меня это, к сожалению, плохо получается. Тем более что по натуре я — волк-одиночка.

— Актерам не рекомендуется заводить романы со своими партнершами по сцене. Говорят, такие браки весьма недолговечны...

— Все мои бывшие жены — актрисы. У меня просто нет времени ходить на дискотеки, в рестораны, специально кого-то искать... Все происходит прямо на сцене. Трудно сказать, по каким причинам подобные браки распадаются. Человеку, который не знает нюансов актерской профессии, многие вещи могут показаться оскорбительными. К примеру, спектакль "Тойбеле и ее Демон" назвали эротическим: мало того что я там все время хожу полуголый, так еще и партнерша обнаженная. Нам с ней приходится и целоваться, и раздеваться. Далекая от театра женщина может неправильно все истолковать, а актриса поймет, что все это понарошку. Хотя...

— Отношения между мужчиной и женщиной тоже в какой-то степени театр... Кстати, о театре. Заметили: в последнее время народ стал активнее ходить на спектакли. Наверное, надоели видеомагнитофоны, чернуха всякая...

— Людям хочется живого общения. Не так давно Молодежный театр был на гастролях в Речице и Светлогорске, показывали "Тойбеле и ее Демон" — спектакль в традициях хорошего сентиментализма. Народ, особенно женщины, плакали. Надеюсь, что это — слезы очищения, вызванные силой искусства...

— Может, плачущим просто любви, тепла и нежности в реальной жизни не хватает?

— Видимо, женщины в данном случае жалеют не столько погибающую героиню спектакля, сколько себя. У нас действительно редкий мужчина пожалеет, приласкает и утешит уставшую или несчастную женщину... Вообще, в провинции публика не испорчена какими-то режиссерскими выкрутасами, не разбалована гастролями заезжих театров. Она какая-то наивная в хорошем смысле этого слова. Может быть, поэтому после спектакля народ выходит какой-то просветленный, порой с ярым желанием начать жизнь снова...

— Сережа, если не секрет, с чем связано, что Вы играете в разных театрах? Не хватает денег на жизнь или у Вас просто жажда творчества?

— В случае с "ART" "виноват" просто Николай Пинигин. Мы знаем друг друга давно, но в работе никогда не пересекались. И тут эта пьеса. Коля говорит: "Или сейчас, или никогда. Это мой дембельский спектакль. Соглашайся". Я бросил все свои дела, буквально заболел этой пьесой. Процесс репетиций был просто потрясающий. Я на них шел, как на творческую встречу с Мастером. Интуитивно чувствовал: это будет нечто... Жаль, что режиссер такого уровня, как Николай Пинигин, покинул Беларусь...

— Сегодня некоторым актерам государственных театров для того, чтобы выйти на сцену, приходится искать спонсоров для спектакля. Вы с этим не сталкивались? И вообще, как Вы думаете, актер в театре, как и бизнесмен, должен хорошо уметь считать деньги?

— Лично у меня не было таких прецедентов. А насчет денег... Смешно говорить: в театре я получаю три миллиона. Естественно, что зарабатывать деньги на жизнь приходится иными способами. И в театр, грубо говоря, приходишь, как в кружок самодеятельности. Полагаю, в Беларуси не осталось ни одного актера, который зарабатывал бы деньги исключительно творчеством. Ну как можно выжить на три миллиона? Конечно, кто-то бьется как рыба об лед — помимо театра и на радио выступает, и в кино снимается. Раньше, между прочим, все это прилично оплачивалось, а сейчас... В кино, например, большие гонорары получают лишь заезжие российские звезды. Нашим актерам платят жалкие копейки... Иногда думаешь: "Что я в театре потерял?" Но... Театр — мое хобби, моя работа, моя жизнь... Я много раз хотел бросить театр. Но со временем понял, что пока будет хоть один спектакль, в котором мне будет нравится играть, никуда не уйду. В Европе, кстати, существуют так называемые театры одного спектакля. Труппа существует до тех пор, пока спектакль интересен публике. Когда он надоедает или перестает приносить доходы, театр распускается. И актеров приглашают (или не приглашают) другие антрепризы. В этом есть рациональное зерно. Не случайно ведь тот же Пинигин для "ARTа" собрал актеров из разных театров. По таким принципам театр может развиваться, быть самоокупаемым. У нас, к сожалению, без дотаций театр гибнет...

— Мне кажется, что белорусский театр гибнет не только из-за финансовых проблем. Достойной смены нынешним мастерам сцены пока как-то не наблюдается. В некоторых провинциальных театрах вообще молодых актеров нет, одни пенсионеры работают...

— Мне кажется, в этой профессии просто стало меньше талантливых людей. Я смотрю на то поколение — Геннадий Гарбук, Виктор Тарасов — что ни имя, то судьба актерская, образы, личность. К тому же сейчас профессия артиста не считается престижной. Сплошное безденежье, театры едва концы с концами сводят. Раньше театр был зрелищем, а теперь... Хорошие костюмы, декорации — большая редкость. Быть актером сегодня больно.

— На Ваш взгляд, что сейчас нужно ставить в театрах — комедии, трагедии? За что зритель заплатит и потом не пожалеет, что заплатил?

— Мне кажется, весьма интересна мелодрама. Ее долгое время не признавали как жанр, презрительно называли слезливо-женской драматургией. Нам сейчас не хватает именно чего-то такого мелодраматического. Чтобы человек всплакнул, утерся и радостный пошел домой. Хотя лично я очень люблю играть в комедиях. Но вообще-то мой самый любимый театральный жанр — трагикомедия. Она более жизненна.

— А по жизни Сергей Журавель — трагик или комик?

— Пессимист. Особенно с утра.

— В каких ролях Вы чувствуете себя наиболее уверенно?

— В отрицательных. Такие роли всегда более яркие, в них чувствуется, как Вы говорите, темперамент.

— У каждого актера есть мечта: кого-то сыграть, что-то поставить. О чем сегодня мечтает Сергей Журавель?

— Когда-то хотелось сыграть Раскольникова, теперь — Свидригайлова. Не знаю, произойдет ли это когда-нибудь: Достоевского сегодня вообще не ставят... С удовольствием согласился на любую роль, которую предложит Николай Пинигин. Для меня в последнее время очень важно, кто руководит процессом и в каком ракурсе режиссер видит ту или иную пьесу. Потому как порой бывает, что у тебя от пьесы одно ощущение, а у режиссера совсем иное. И никаких точек соприкосновения...

— Актерам часто завидуют. Мол, они могут выражать свои человеческие фантазии на сцене. Выражать то, что простой человек в своей реальной жизни сам испробовать никогда не сможет. Прожить натурально искусственную, театральную жизнь, испытать театральные эмоции — это и есть актерское счастье? И чем оно для Вас измеряется?

— Если высокопарно, то счастье — это когда я, выходя на поклон, вижу просветленные лица, улыбки, цветы. А если попростому, по-человечески, по-настоящему, то для меня актерское счастье — когда я прихожу домой, сажусь на диван, включаю телевизор и у меня внутри свербит что-то, выражаясь по-белорусски, муліць нешта. В такие моменты я обычно думаю: "Как хорошо, что я стал артистом!.." Счастье, когда на твоих спектаклях плачут профессиональные актеры и режиссеры, забывая, что все это — театр... Актерское счастье измеряется еще и покоем, который разливается после спектакля внутри, где-то рядом с душой... Но у актерского счастья короткий век. И утром я снова с огромным пессимизмом думаю о том, что придется тащиться на репетицию...

Стоп-кадр



Схватка.

Фото Геннадия СЕМЕНОВА, БелТА.

Конкурс

«Наш дом – Беларусь у XXI стагоддзі»

Культурніцкае аб'яднанне моладзі «Будзіны» пры падтрымцы дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля», Беларускай асацыяцыі журналістаў, Таварыства беларускае мовы абвяшчае II-гі тур конкурсу:

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаем дзяцей і падлеткаў ад 6-гадовага да выпускнога ўзросту.

Конкурс праходзіць у трох жанрах: ***мастацтва, паэзія, проза***.

Запрашаем узяць удзел у пяці намінацыях з падтэмамі:

1. «Беларусь — наша Бацькаўшчына, наша Маці»:

а) Край наш — дзівосны прыстанак загадак і цудаў. (М.Гусоўскі). б) Беларусь, прачынайся! Я цябе абуджаю. (Ул.Караткевіч).

2. «Беларусь — наш Дом, наш Храм»:

а) Кінь вечны плач свой аб старонцы. (М.Багдановіч). б) Беларусь! Ты ўсёй Зямлі акраса. (А.Русецкі).

3. «Беларусы — Еўрапейскі народ»:

а) Дык жа ўцям! На Беларусі — Жывуць Беларусы! (Я.Купала). б) Беларусь, твой народ дачакаецца, залацістага, яснага дня! (М.Багдановіч).

4. «Абаронім наш дом — Беларусь!»:

а) Над нашай Незалежнасцю лунае Касцюшкавага меча блаславенне! (Р.Барадулін). б) Асланяйце Беларусь Святую! Вечны той, хто родны Край ратуе! (Р.Барадулін).

5. «Выратуем Беларусь ад чарнобыльскай бяды»:

а) Артыкул, верш, малюнак, аповед. б) Ідэі, праграмы і праекты сацыяльнай абароны і падтрымкі «Дзяцей Чарнобыля».

Да конкурсу ў пятай намінацыі запрашаюцца студэнты ВНУ!

Падводзіць вынікі II-га туру будзе аўтарытэтнае журы ў складзе: Рыгор Барадулін — народны паэт Беларусі (сустаршыня журы), Генадзь Грушавы — прафесар (сустаршыня журы); мастакі: Аляксей Марачкін, Мікола Купава, Алесь Шатэрнік, Хведар Ладуцька, Яўген Кулік, Сяргей Крыштаповіч; паэты: Сяржук Законнікаў, Генадзь Бураўкін, Міхась Скобла, Артур Вольскі; пісьменнікі: Міхась Тычына, Уладзімір Арлоў, Васіль Сёмуха, Алесь Разанаў.

Конкурс мае праходзіць з 1 лістапада 1998 года па 30 студзеня 1999 года.

27 лютага адбудзецца святочны фэст-узнагароджанне пераможцаў і віншаванне ўдзельнікаў конкурсу.

Для пераможцаў прадугледжаныя ўзнагароды і каштоўныя прызы, для ўдзельнікаў — заахвочвальныя падарункі.

Свае працы спадарства можа даслаць на адрас: а/с № 33, Мінск-134, 220134, Беларусь.

У метрыцы да працы, дасланай на конкурс, належыць пазначыць абавязкова: адну з намінацыяў, да якой належыць праца; адну з падтэмаў у гэтай намінацыі; свой узрост; хатні адрас, тэлефон (калі ёсць). Калектыўныя працы павінны мець спіс усіх удзельнікаў. Падайце таксама адрас вашай навучальнай установы.

Крымінальная хроніка

Фальшыўкі гуляюць па руках

Грамадзяне нашай рэспублікі па-ранейшаму пападаюцца на "вудачку" дзялкоў, якія прапануюць паслугі па абмене валюты.

Як паведамілі БелТА ў прэс-службе МУС, толькі 7 снежня ў Мінску, Брэсце, Гродне, Пінску, Капылі і Слоніме супрацоўнікі праваахоўных органаў канфіскавалі 11 фальшывак вартасцю 100 і 50 долараў. Акрамя таго, была выяўлена і адна фальшывая пяцідзесяцітысячная купюра Нацыянальнага банка Беларусі.

Сярод белага дня...

Работнікі брэсцкай міліцыі 7 снежня канфіскавалі каля чатырох кілаграмаў наркотыкаў. Паводле інфармацыі, атрыманай БелТА ў прэс-службе МУС, супрацоўнікі аддзела па барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў затрымалі траіх непрацуючых мясцовых жыхароў. У іх знайшлі 3 літры экстракту опію і 950 грамаў макавай саломкі. Вядзецца разбор.

БелТА.

SPARKY ЭЛЕКТРОИНСТРУМЕНТ
- ДРЕЛИ
- ПЕРФОРАТОРЫ
- УГЛОШЛИФМАШИНЫ
- ОТРЕЗНЫЕ ШЛИФОВАЛЬНЫЕ КРУГИ
- ПЕРЕНОСНЫЕ БЕНЗИНОВЫЕ ЭЛЕКТРОСТАНЦИИ 220/380V, 2,2 —6 кВт
- КОМПРЕССОРЫ (Италия 510л/мин., 380V)

Тел. : (017) 232-56-38, 232-10-93.

ЗАО "ТехФинСервис"
Генеральный представитель ОАО "Ногинский завод топливной аппаратуры" в Республике Беларусь
РЕАЛИЗУЕТ:
ПЛУНЖЕРНУЮ ПАРУ и распылители (900 000 руб.)
НАСОСЫ ВЫСОКОГО ДАВЛЕНИЯ для двигателей
(Д-21,Т-16,-25)-17000000 руб., (Д-240,-37,Т-40)-20000000руб., (А-41)- 26000000 руб.,
(СМД-14,-18,ДТ-75)- 21000000 руб., (Д-65,ЮМЗ-6)- 22500000 руб., (Д-245)- 28400000 руб.,
и все запасные части к ним в том числе:
ТОПЛИВОПОДКАЧИВАЮЩИЕ НАСОСЫ (3000000 руб.,в том числе КАМАЗ - 2000000 руб.)
НАСОСЫ РУЧНОЙ ПОДКАЧКИ (1240000 руб.)
ФОРСУНКИ для всех типов дизельных двигателей
реализуем запчасти к Т-150К
Наш адрес: Смолевичский рн., д.Кривая Береза (территория Смолевичской сельхозтехники)
Тел./факс: (01776) 55-2-95, 54-0-66, 63-7-36.

Спорт

Рудніцкі і Іванкоў робяць фурор у Швейцарыі

Даволі паспяхова выступілі на швейцарскім турніры "Кубак Артура Гандэра" беларускія гімнасты. У шматбор'і тут першынстваваў, прычым другі год запар, магіляўчанін Віталь Рудніцкі, які не зрабіў ніводнай памылкі, набраўшы максімальную колькасць балаў. На пяць сотых бала адстаў ад яго другі наш суайчыннік двухкратны абсалютны чэмпіён свету і Еўропы Іван Іванкоў. Зазначым, што Віталь таксама здолеў апярэдзіць і такіх прызнаных мэтраў гімнастыкі, як алімпійскіх чэмпіёнаў Атланты Аляксея Немава і Валерыя Беленькага. Што датычыцца фіналаў на асобных снарадах, то і тут перавага была за нашымі. Іванкоў перамог на трох снарадах з чатырох — на кані, кольцах і брусах.

Зміцер ЯРМАК.

Четверг, 10 декабря

БТ

06.30, 07.10 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
08.10 "Сегодня с вами..." Фитодизайнер Наталья Матвеева.
08.45 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.00 Новости.
09.10 Судьба моя и надежда. Социальная реабилитация инвалидов.
09.35 Родное слово. Иван Шамякин: размышления о белорусском языке.
10,05 "Все мы родом из детства". Третий Всебелорусский фестиваль юных талантов. Гала-концерт. Ч. 1-я.
11.00 Новости.
11.10 "Доктор Финли". Телесериал (Великобритания).
12.05 Гости в дом. К 50-летию Декларации прав человека.
12.30 Королевская охота.
13.00 Новости.
13.15 Е.Яковлева, И.Смоктуновский, О.Табаков в х/ф по пьесе А.Н.Островского "Сердце не камень". 1-я с. (творческое объединение "Экран").
14.20 Зорная ростань. Телеконкурс молодых артистов эстрады.
15.00 Новости.
15.10 Видеокурс английского языка. Передача 20-я.
15.35 ТВ — школе. История Беларуси. 10-й класс. Основные взгляды историков на процесс и причины создания Великого княжества Литовского.
16.05 Мультфильм.
16.15 "Внимание! Говорят дети". Ко Дню прав человека.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.10 Концертный сезон. П.И.Чайковский. Концерт № 1 для фортепиано с оркестром. Исполнители: симфонический оркестр Белорусской академии музыки "Молодая Беларусь", солистка Тамара Саникидзе (Грузия).
17.50 "Охота в чужой стране". Д/ф (Киевское телевидение).
18.05 "Доктор Финли". Телесериал (Великобритания).
19.00 Новости.
19.15 "Сегодня с вами..." Директор Республиканского центра досуга инвалидов Алла Некрасова.
19.50 Криминальная хроника.
20.10 Сделано в Беларуси. Энергосберегающие технологии. Приборы учета и контроля.
20.30 "Смеяться — не грех". Развлекательная программа "Марсово поле".
20.45 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
21.50 Белорусский хит-парад.
22.00 Е.Симонова и Н.Караченцов в х/ф "Долгая дорога к себе" ("Ленфильм").
23.20 "Крок". Программа для молодежи.
23.50 Новости.
00.00 Акколада. Музыкально-развлекательная программа.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.45 Новости.
08.15 Сериал "Жестокий ангел".
09.15 Человек и закон.
10.00 Клуб путешественников.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Новые приключения Синдбада".
14.50 Классная компания.
15.05 Умники и умницы.
15.35 „До шестнадцати и старше.
16.00 Сериал "Жестокий ангел".
17.15 Эти забавные животные.
17.45 "Здесь и сейчас".
18.05 "Чтобы помнили...".
18.45 Сериал "Улицы разбитых фонарей II".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.50 Х/ф "Королева бензоколонки" (1963 г.).
22.15 Док. детектив "Ошибка Андрея Громыко, или Порывая с Москвой...".
23.00 "Тихий дом".

РТР

06.00, 08.30, 08.50 Доброе утро, Россия!
08.15 Дежурная часть.
08.35 Телеигра "Программа передач".
08.55 Товары — почтой.
09.00 Сериал "Санта-Барбара".
09.45 Музыка, музыка.
10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вести.
15.15 Сказочный полдник.
15.30 Сериал "Первые поцелуи".
16.35 "Башня".
17.00 Компьютер.
17.20 "Жизнь и смерть Лаврентия Берии". Д/ф. 1-я с.
18.30 Дежурная часть.
18.35 История одного события.
19.35 Подробности.
19.45 "Два рояля".
20.30 Сериал "Грязные танцы".
21.00 Сериал "Молль Флендерс. Ее радости и горести".
21.55 Сериал "Притворщик".
22.45 Дежурная часть.

КУЛЬТУРА

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 Х/ф "Жених с того света" (1958 г.).
08.10 "Слышать себя".
08.30 Образ жизни.
09.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 Д/ф "Сказы матушки Фроси о монастыре "Дивеевском", "Николай Клюев".
09.55 Парадоксы истории.
10.25 Музыкальный антракт.
10.40 Д/ф "Как могу, Господи".
11.40 Разбитая чашка от Кузнецова.
12.25 Поклонникам Терпсихоры.
12.40 Лики истории.
13.05 Сгоревшие рукописи.
13.45 И.С.Бах. Страницы жизни и творчества.
14.30 "Кто там...".
15.05 Сериал "Ветер жатвы".
16.00 "Лукоморье".
16.20 Театральный роман.
16.55 Паноптикум.
17.05 "Сокровища Петербурга".
17.20 "Российский курьер".
18.00 Юбилейный вечер Ю.Темирканова.
21.30 Х/ф "Жених с того света".
22.20 "Контакт".
22.40 Джазофрения.

НТВ

05.00 Сегодня утром.
08.30 Криминал. Чистосердечное признание.
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.15 Музыкальный фильм "Пой, ковбой, пой".
10,35 Мультфильм "Сказка о попе и о работнике его балде".
11.20 "Старый телевизор".
13.25 Сериал "Вторая возможность".
14.10 Сегодняшко.
15,20 Сериал "Золотые крылья Пенсаколы".
16.05 "Сегодняшко". Красная стрела.
16.35 Сериал "Доктор Куин, женщина-врач".
17.30 Впрок.
17.40 Криминал.
18.35 Герой дня.
18.50 Х/ф "Гардемарины, вперед!". 4-я с.
20,15 "Жизнь Солженицына". Фильм 4-й.
21.40 Сериал "Скорая помощь".
22.30 Сегодняшко.
23.10 Сегодня в полночь.
23.35 Великая магия Лас-Вегаса.
00.00 Обзор матчей Лиги чемпионов.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Копланда.
18.30 Мультфильм "Динозаврик Динк".
18.45 Сериал "Патруль времени".
19.45 Новости "К-видео".
20.15 Вечарніца.
20.30 Х/ф "И это все о нем". 4-я с.
21.45 Музпарад.
22.00 Комедия "Привидения этого не делают".

TV-6

06.05 День за днем.
07.45, 16.45, 22.35 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00, 22.50 ТСН-6.
08.15, 17.30 Сериал "Грейс в огне IV".
08.40, 18.00 Сериал "Смерть в Калифорнии".
09.35, 11.00, 14,10 Телемагазин "Спасибо за покупку!".
10.10 Сериал "Зов убийцы".
11.15, 23.50 "Знак качества".
11.30 "Вы — очевидец".
12.10 Криминальная комедия "Палуказвиль".
14.20 Сериал "Страсти".
15.15 Мультсериал "Необычайные приключения в волшебном лесу".
15.35 Сериал "Подростки с улицы Деграсси".
16.10, 23.15 ДИСК-канал.
19.00 "Новости дня".
19.30 О.С.П.-студия.
20.30 Сериал "Lexx II".
21.30 "В мире людей".
22.10 "ОБОZZZ"-шоу.
23.00 Те Кто.
00.05 "Эра Водолея" с Иваном Кононовым.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя адказнасці не нясе.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мядзьвяк". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №1457